# РОЛЯ ВАЛЯНЦІНА ТАЎЛАЯ Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ АДРАДЖЭННІ БЕЛАРУСІ

***В. І. Канюта***

*Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом Звязда»,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
veronika_kanyuta@mail.ru*

Даследуецца жыццёвы шлях аднаго з найбольш яркіх дзеячаў нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі – паэта Валянціна Таўлая, які ў пачатку 1930-х гадоў працаваў у газеце «Звязда».

***Ключавыя словы:*** журналістыка; газета «Звязда»; Валянцін Таўлай; Заходняя Беларусь; нацыянальна-вызваленчы рух.

# THE ROLE OF VALENTIN TAVLAI IN THE NATIONAL REVIVAL OF BELARUS

***V. I. Kanyuta***

*Publishing institution «Publishing house «Zvyazda»,
10-a, B. Khmelnitskogo Str., 220013, Minsk, Republic of Belarus
Corresponding author: V. I. Kanyuta (veronika_kanyuta@mail.ru)*

The article examines the life path of one of the most prominent figures of the national liberation movement in Western Belarus – the poet Valentin Tavlai, who in the early 1930s worked for the newspaper «Zvyazda».

***Key words:*** journalism; newspaper «Zvyazda»; Valentin Tavlai; Western Belarus; national liberation movement.

Упершыню сёлета мы будзем адзначаць новае для беларусаў свята – Дзень народнага адзінства. У ходзе шматлікіх дыскусій шырокай грамадскасцю была вызначана дата – 17 верасня. Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам 7 чэрвеня 2021 года быў падпісаны адпаведны Указ [1].

З гэтай датай звязана нямала канкрэтных гістарычных фактаў і падзей, якія паспрыялі аб'яднанню Заходняй і Усходняй Беларусі ў 1939 годзе. Як вядома з гісторыі, у выніку савецка-польскай вайны 1920 года тэрыторыя Беларусі была падзелена паміж дзвюма дзяржавамі. Ва

ўсходняй яе часткі была створана Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР), якая ўвайшла ў склад СССР. Заходнія тэрыторыі пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора (18 сакавіка 1921 г.) былі далучаны да Польшчы. 1 верасня 1939 года нямецкія войскі перайшлі мяжу з Польшчай – пачалася Другая сусветная вайна. Гітлераўскія дывізіі набліжаліся да тэрыторыі Заходняй Беларусі – савецкаму ўраду неабходна было прымаць меры па забеспячэнні ўласнай бяспекі, а разам з тым вырашаць лёсы мільёнаў беларусаў, якія пражывалі на акупаванай тэрыторыі. Раніцай 17 верасня 1939 года Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую мяжу і пачала вызваленчы паход.

Гэтага дня чакалі тысячы беларусаў, якія працяглы час знаходзіліся пад польскім прыгнётам. Лёсавызначальнай гэтая падзея стала для дзеячаў нацыянальнага адраджэння ў Заходняй Беларусі, якія прыклалі шмат намаганняў у справе захавання беларускай дзяржаўнасці. Сярод найбольш яркіх прадстаўнікоў нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі быў вядомы заходнебеларускі паэт Валянцін Таўлай, які ў пачатку 1930-х гадоў з’яўляўся літаратурным супрацоўнікам газеты «Звязда».

Яго лёс, як і многіх змагароў за незалежнасць Беларусі, быў няпросты. Нарадзіўся Валянцін Таўлай 8 лютага 1914 года ў Баранавічах. Быў старэйшым за сваіх братоў. Сям’я жыла на колах: бацька-чыгуначнік часта мяняў месца працы. Дзеці былі яшчэ малыя, калі маці, Марыя Антонаўна, памерла ад халеры. Гадавала іх бацькава маці – бабуля Аўдоцця. Вось як характарызаваў яе В. Таўлай: «Гэта звычайная вясковая жанчына. Даволі доўгае знаходжанне ў гарадах не адбівалася ні ў яе мове, ні на вопратцы, ні на звычаях і абыходжанні. Зусім непісьменная. Бясконца працавітая і цярплівая. Невычарпальная крыніца народных казак...» [2, с. 138].

Калі Таўлаі пераехалі ў родную вёску бацькі, што недалёка ад Зэльвы, Павел Дзям’янавіч падаўся ў Ліду шукаць працу. Валянцін, бабуля і двухгадовы брат Саша засталіся ў вёсцы. Жыццё пры палякаx было нялёгкае. Неўзабаве Павел Дзям’янавіч забраў старэйшага сына ў Ліду вучыцца. У 1921 годзе Валянцін Таўлай пайшоў у першы клас польскай школы. Ён не разумеў чужой мовы, аднакласнікі насміхаліся з яго беларускага паходжання, называлі «кацапам». Аўтарытэт падрос, калі Таўлай стаў пісаць. Свой першы верш «Wrybelki» («Верабейкі») ён напісаў на польскай мове ў сем гадоў. Чытаў яго перад усім класам. Настаўніца, патрапаўшы яго па шчацэ, сказала: «Добра, пішы! Можа, некалі будзеш сапраўдным паэтам».

І ён стаў. Толькі перш давялося прайсці праз шматлікія выпрабаванні. Асабліва «ўскладняла» жыццё хлопцу яго беларускае паходжанне, на якое ўвесь час указвалі палякі. Але Таўлай ніколі не здрадзіў сабе. Як і яго бацька, якога ў 1924 годзе скарацілі з працы з-за таго, бо ён не паляк. Павел Дзям'янавіч і дагэтуль быў рашуча настроены супраць усяго польскага, але гэта стала апошняй кропкай. Ён пачынае гуртаваць вакол сябе сялян, якія мараць аб нацыянальным адраджэнні. У вёсцы Вялікая Кракотка, што на Слонімшчыне, старэйшы Таўлай арганізоўвае беларускую школу, дзе вучыцца і Валянцін, стварае гурток «Грамада», куды ўваходзяць беларусы, не згодныя з палітыкай паланізацыі. Збіраючыся ў хаце Таўлаяў, аднадумцы абмяркоўваюць, што ім рабіць на ніве нацыянальнага адраджэння, чытаюць беларускія газеты. Мова гучыць толькі родная.

Уся рэвалюцыйная дзейнасць перадалася Валянціну Таўлаю ад бацькі, які заўсёды казаў яму: «Сынок, не цурайся роднай мовы. Адстойвай нацыянальнасць беларуса!» Ён ажаніўся другі раз. Мачаха-настаўніца, Сцепаніда Паўлаўна Дарашкевіч, рыхтавала Валянціна да паступлення ў Слонімскую настаўніцкую семінарыю. Паступіў, але правучыўся нядоўга: барацьбіты за беларускае самавызначэнне польскай уладзе былі не патрэбны. Пасля зімы Таўлай едзе вучыцца ў Беларускую гімназію ў Вільні. Там ён хутка знаходзіць сваіх аднадумцаў. Змагары за нацыянальную і сацыяльную незалежнасць выпускаюць газету, ствараюць тэматычныя лістоўкі, наведваюць вязняў турмы ў Лукішках, вывешваюць нацыянальны сцяг на савецкія святы. Актыўна ўдзельнічае ў палітычнай барацьбе і Таўлай.

Пасля зімовых канікулаў на другім курсе пісьменніка адлічылі. Ён зноў вяртаецца дамоў. Вакол Валянціна гуртуецца вясковая моладзь. Яго дзейнасць не застаецца незаўважанай: за ім увесь час сочаць. Аднойчы Таўлай вырашае трапіць у Савецкі Саюз. Зімовай ноччу пераходзіць чыгунку ў раёне Маладзечна. Пісьменніка затрымліваюць на польскім баку і садзяць у турму. Пазнейшая спроба пераходу граніцы была больш удалай. У Мінску Валянцін Таўлай паступае на літфак БДУ. Паралельна супрацоўнічае з Камуністычнай партыяй Заходняй Беларусі, з'яўляецца членам Беларускага аб'яднання пралетарскіх пісьменнікаў, працуе літаратурным рэдактарам легальнага рэвалюцыйнага органа «Беларуская газета». А ў пачатку 1930-х гадоў ён – літаратурны супрацоўнік газеты «Звязда», дзе актыўна друкуе свае вершы.

У снежні 1933 года ў Вільні Валянцін Таўлай арганізаваў і правёў першую канферэнцыю рэвалюцыйных пісьменнікаў Заходняй Бела-

русі, а таксама падрыхтаваў да друку першы рэвалюцыйны часопіс «Літаратурная старонка». Падчас спробы вяртання ў Беларусь каля Радашковічаў яго разам з сябрам Якубам Міско арыштавалі. У студзені 1934 года пасадзілі ў турму ў Лукішках. Там ён знаёміцца з Максімам Танкам, разам выпускаюць рукапісны часопіс «Краты». Пракурор казаў у судзе пра Таўлая як пра самага таленавітага і небяспечнага крамольніка: «Мы павінны выбіць з рук гэтых людзей аловак і паперу, пазбавіць іх магчымасці пісаць і бунтаваць...» [2, с. 243]. Далі яму 8 гадоў турмы, але пачалася Другая сусветная вайна.

Таўлай вяртаецца ў Мінск. Неўзабаве яго накіроўваюць у Заходнюю Беларусь для падпольнай работы. Тут яго зноў арыштоўваюць. На гэты раз Таўлай адбывае пакаранне ў Гродзенскай турме. На падлозе ў камеры каменьчыкамі піша вершы. Зняволеныя, якія выходзілі на свабоду, ведаючы іх на памяць, расказвалі сваім знаёмым – вершы распаўсюджваліся імгненна, таму выйшаў на волю Таўлай ужо вядомым паэтам.

Калі пачалося вызваленне Заходняй Беларусі, Таўлай знаходзіўся ў Гродзенскай турме. Як расказваюць гісторыкі, Гродна чырвонаармейцы бралі вельмі цяжка (Звязда. 2021. 14 жніўня). Калі вызвалілі вязняў, Валянцін разам з некаторымі аднадумцамі дамоў не пабег. Знайшлі прафсаюзны камітэт, атрымалі там абмундзіраванне і зброю, пачалі выступаць супраць палякаў. Калі да апошніх падышло падмацаванне, учарашніх вязняў зноў пасадзілі ў турму. Па ўспамінах пісьменніка, у тую ноч ніхто не спаў. Усе чакалі, што вось-вось расчыняцца дзверы і іх выведуць на расстрэл. Але своечасова вярнуліся савецкія войскі.

Пасля аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР Валянцін вярнуўся ў Ліду, дзе жыла яго сям'я. За гэты час у старэйшага Таўлая нарадзілася дачка – Ніна, сястра пісьменніка, сёння жыве ў Вільнюсе. У верасні 1939 года ў Лідзе ствараецца раённая газета «Уперад» (цяпер «Лідская газета»), і Валянцін Таўлай з'яўляецца адным з яе першых супрацоўнікаў. У ім працягвае жыць рэвалюцыянер: ходзіць па прадпрыемствах, прапагандуе савецкія лозунгі, вядзе актыўную палітычную работу. Са сваёй першай жонкай Кірай Брант яны пасяляюцца ў будынку, дзе цяпер знаходзіцца Дом Таўлая ў Лідзе (філіял Лідскага гісторыка-мастацкага музея). Але шчасце доўжыцца нядоўга – пачынаецца Вялікая Айчынная вайна. В. Таўлай пераязджае ў Навагрудак, дзе ўладкоўваецца памочнікам пісара ў гміну. Ён працуе на немцаў. Але гэта толькі прыкрыццё: выкарыстоўваючы сваю пасаду, паэт дапамагае беларусам. А калі актыўна пачаў распаўсюджвацца партызанскі рух, падпольна супрацоўнічае з народнымі мсціўцамі: ён са сваёй другой

жонкай Лідзіяй Казлоўскай былі сувязнымі двух партызанскіх атрадаў – імя Катоўскага і «Буравеснік». Маладыя людзі пажаніліся ў снежні 1942 года. Лідзія была руская, перад вайной студэнтка Ленінградскага кінематаграфічнага інстытута аказалася ў Беларусі. Людзі бачылі, што Валянцін часта ходзіць у лес, але яго настолькі паважалі, што ніхто не выдаў. Гітлераўцы так ніколі і не даведаліся, што чалавек, якому яны давяралі, таемна выносіў дакументы, забяспечваў важнай інфармацыяй партызан і нават друкаваўся ў агітплакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну» (Звязда. 2021. 19 ліпеня).

Пасля вызвалення Валянцін Таўлай працаваў у навагрудскай газеце «Звязда». Пазней пераехаў у Мінск, уладкаваўся ў Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, быў першым памагатым у цёткі Уладзі. Друкаваўся ў беларускіх літаратурных выданнях: у «Звяздзе», газеце «Літаратура і мастацтва». Нягледзячы на тое, што быў ужо дастаткова вядомым паэтам, жыў Таўлай сціпла. «Заходзіць у рэдакцыю Янка Брыль і рагоча: «У Таўлая ж няма дома аніякага свайго стала! За тым сталом, на якім жонка гаспадыніць, яны і ўсаджваюцца есці, ён па начах і варожыць над паперай!» Брыль і Таўлай суседнічалі тады ў адным доміку амаль за мяжой горада» (Літаратура і мастацтва. 2010. 22 кастрычніка).

Пасля вайны ў В. Таўлая нарадзілася доўгачаканая дачушка Галінка – менавіта так ён яе называў. Але нацешыцца малой не паспеў. У яго былі праблемы з сэрцам. Сапраўдны беларус, яркі дзеяч нацыянальнага вызваленчага руху пайшоў з жыцця вельмі рана. Яму было ўсяго 33 гады. Пры жыцці знакаміты паэт не ўбачыў ніводнай сваёй кнігі: тая, якую сам падрыхтаваў да выдання, выйшла з друку ўжо пасля яго смерці.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. Аб зменах Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (карэкціруецца Указ № 157 ад 26 сакавіка 1998 г. «Аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь») [Электронны рэсурс]. URL: https://president.gov.by/ru/documents/ukaz-no-206-ot-7-iyunya-2021-g (дата звароту: 29.08.2021).
2. *Таўлай В. П.* Выбраныя творы; уклад., прадм. і камент. А. Клышкі. Мінск: Беларуская навука, 2014. 413 с.